УДК [94(476) + 342.53(476)(091)] ”1944/1964”

# ЗМЕНЫ Ў СКЛАДЗЕ ЎРАДА БЕЛАРУСКАЙ ССР У 1944–1964 гг.

**Несцяровіч Мікалай Барысавіч**
кандыдат гістарычных навук,
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

У перыяд 1944–1964 гг. урад Беларускай ССР – Савет Міністраў БССР (Савет Народных Камісараў БССР – да 15 сакавіка 1946 г.) па-ранейшаму з’яўляўся калегіяльным органам, які ўтвараўся Вярхоўным Саветам рэспублікі. Канстытуцыяй БССР 1937 г. устанаўліваўся пералік асоб, якія ўваходзілі ў склад



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.

урада рэспублікі. Паводле яе СНК БССР складаўся з Старшыні СНК, намеснікаў Старшыні СНК, старшыні Дзяржаўнай планавай камісіі БССР, народных камісараў (харчовай, лёгкай, лясной, мясцовай прамысловасці, земляробства, збожжавых і жывёлагадоўчых саўгасаў, фінансаў, гандлю, унутраных спраў, юстыцыі, аховы здароўя, асветы, камунальнай гаспадаркі, сацыяльнага забеспячэння), упаўнаважанага Камітэта нарыхтовак СССР, начальніка Упраўлення па справах мастацтваў, упаўнаважаных агульнасаюзных народных камісарыятаў. Пры стварэнні новых і ліквідацыі раней дзеючых цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання, кіраўнікі якіх па сваім статусе ўваходзілі ў склад урада, Вярхоўны Савет БССР уносіў у Канстытуцыю змяненні. З улікам гэтых змяненняў у 1944–1946 гг. у складзе беларускага ўрада ўжо не было паста ўпаўнаважанага Камітэта нарыхтовак СССР, але з'явіліся пасады народных камісараў мясной і малочнай, тэкстыльнай, мясцовай паліўнай прамысловасці, дзяржаўнай бяспекі, дзяржаўнага кантролю і інш. [1, с. 20–23; 2, с. 9–10].

Склад урада БССР фарміраваўся на кожнай першай сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі новага склікання. У далейшым пры неабходнасці па прадстаўленні Старшыні Савета Міністраў БССР Прэзідыўм Вярхоўнага Савета БССР уносіў частковыя змены ў склад урада з наступным зацвярджэннем іх Вярхоўным Саветам БССР. Часцей за ўсё гэтыя змены адбываліся ў сувязі з перамяшчэннямі кіруючых работнікаў, якія ўваходзілі ў наменклатуру Савета Міністраў рэспублікі.

Першая сесія Вярхоўнага Савета БССР другога склікання, якая адбылася 12–14 сакавіка 1947 г.[1] утварыла ўрад БССР у складзе 35 чалавек на чале са Старшынёй Савета Міністраў БССР П.К. Панамарэнка, які займаў гэтую пасаду з лютага 1944 г. (да яго ўрад Беларусі з 1940 г. ўзначальваў І.С. Былінскі). У склад урада ўвайшлі намеснікі Старшыні Савета Міністраў Г.Б. Эйдзінаў, К.В. Кісялёў (ён жа міністр замежных спраў), С.С. Касцюк, Г.С. Лахтанаў, В.С. Забела, А.С. Шаўроў, А.П. Эльман, І.Л. Чорны (ён жа старшыня Дзяржаўнай планавай камісіі БССР), міністры В.В. Драбышэўскі (аўтамабільнага транспарту), С.С. Бельчанка (унутраных спраў), І.Ф. Валошын (дзяржаўнага кантролю), Л.Ф. Цанава (дзяржаўнай бяспекі), І.І. Рыжыкаў (жыллёва-грамадзянскага будаўніцтва), М.І. Кавалёнак (аховы здароўя), М.Ф. Садковіч (кінематаграфіі), І.М. Драгун (камунальнай гаспадаркі), І.Л. Сацункевіч (лёгкай прамысловасці), С.К. Пыж (лясной прамысловасці), Я.Н. Каган (мясцовай прамысловасці), В.Я. Уласаў (мясцовай паліўнай прамысловасці), З.М. Галадушка (меліярацыі), С.П. Мельнікаў (мясной і малочнай прамысловасці), Н.Г. Грэкава (харчовай прамысловасці), М.В. Зімянін (асветы), П.Н. Нікіцін (сельскай гаспадаркі), І.А. Крупеня (саўгасаў), Г.І. Байдакоў (прамысловасці будаўнічых матэрыялаў), Е.Т. Гуцянкова (сацыяльнага забеспячэння), А.В. Гарачкін (тэкстыльнай прамысловасці), В.І. Выхадцаў (гандлю), А.Ф. Кулікоў (фінансаў), І.А. Падута (юстыцыі), старшыня Камітэта па справах культурна-асветных устаноў пры Савеце Міністраў БССР М.А. Мінковіч, начальнік Упраўлення па справах мастацтваў пры Савеце Міністраў БССР П.В. Лютаровіч [3, с. 36–46, 54–56].

12 верасня 1948 г. П.К. Панамарэнка ў сувязі з абраннем яго Сакратаром ЦК УКП(б) быў вызвалены ад абавязкаў Старшыні Савета Міністраў БССР і гэтую пасаду заняў А. Я. Кляшчоў [4, арк. 26].

5 красавіка 1951 г. на першай сесіі Вярхоўнага Савета БССР трэцяга склікання быў сфарміраваны новы склад беларускага ўрада на чале з А.Я. Кляшчовым у колькасці 33 чалавек. Пры гэтым 18 з іх з'яўляліся членамі складу Савета Міністраў, абранага на першай сесіі Вярхоўнага Савета БССР другога склікання, уключаючы 16 чалавек, якія захавалі ранейшыя пасады. У новы склад урада ўвайшлі намеснікі Старшыні Савета Міністраў У.Г. Кудраеў, А.С. Шаўроў, А.І. Золаў, К.В. Кісялёў (ён жа міністр замежных спраў), І.Л. Чорны (ён жа старшыня Дзяржплана БССР), Е.І. Уралава, міністры В.В. Драбышэўскі (аўтамабільнага транспарту), С.С. Бельчанка (унутраных спраў), Л.Ф. Цанава (дзяржаўнай бяспекі), А.Ф. Кулікаў (дзяржаўнага кантролю), І.І. Рыжыкаў (жыллёва-грамадзянскага будаўніцтва), І.А. Інсараў (аховы здароўя), С.А. Варно (камунальнай гаспадаркі), М.Ф. Садковіч (кінематаграфіі), І.Л. Сацункевіч (лёгкай прамысловасці), Ф.А. Самуйленка (лясной прамысловасці), І.С. Былінскі (лясной гаспадаркі), М.Д. Шаройка (мясной і малочнай прамысловасці), П.М. Брэнч (мясцовай прамысловасці), В.Я. Уласаў (мясцовай паліўнай прамысловасці), З.М. Галадушка (меліярацыі), І.М. Ільюшын (асветы), Г.І. Байдакоў (прамысловасці будаўнічых матэрыялаў), В.А. Сысоева (харчовай прамысловасці), С.С. Касцюк (сельскай гаспадаркі), П.З. Калінін (саўгасаў), Е.Т. Гуцянкова (сацыяльнага забеспячэння), П.І. Котаводаў (гандлю), Ф.Л. Коханаў (фінансаў), старшыня Камітэта па справах культурна-асветных устаноў пры Савеце Міністраў БССР М.А. Мінковіч, начальнік Упраўлення па справах мастацтваў пры Савеце Міністраў БССР П.В. Лютаровіч [5, с. 209–214, 221–223].

У сувязі з тым, што ў ходзе рэформы кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам, якая пачалася ў СССР у маі 1957 г., у Беларусі было скасавана 9 міністэрстваў, колькасны склад Савета Міністраў БССР скараціўся. З 29 мая 1957 г. у склад беларускага урада сталі ўваходзіць Старшыня Савета Міністраў, яго намеснікі, Старшыня Савета народнай гаспадаркі БССР, міністры саюзна-рэспубліканскіх (аховы здароўя, гандлю, дзяржаўнага кантролю, замежных спраў, культуры, сельскай гаспадаркі, саўгасаў, сувязі, унутраных спраў, фінансаў, хлебапрадуктаў) і рэспубліканскіх міністэрстваў (асветы, меліярацыі, сацыяльнага забеспячэння, юстыцыі), старшыні Дзяржаўнай планавай камісіі, Дзяржаўнага навукова-тэхнічнага камітэта, Камітэта дзяржаўнай бяспекі і начальнік Галоўнага ўпраўлення будаўніцтва пры Савеце Міністраў БССР [6, 1957, № 5, арт. 95].

Далейшае памяншэнне колькаснага складу ўрада Беларусі адбылося ў выніку скарачэння колькасці намеснікаў яго старшыні, што відавочна было звязана з барацьбой з бюракратызмам у дзяржаўным кіраванні, якая ўзмацнілася ў СССР у гэты час. 2 ліпеня 1958 г. Е.І. Уралава, старшыня Дзяржплана БССР С.М. Малінін, міністр гандлю БССР А.С. Шаўроў[2] і міністр замежных спраў БССР К.В. Кісялёў, якія займалі пасады намеснікаў Старшыні Савета Міністраў БССР, былі вызвалены ад іх [6, 1959, № 1, арт. 8]. Такім чынам, Е.І. Уралава пакінула працу ва ўрадзе і яго склад скараціўся на 1 чалавека.

Усе гэтыя змены ў складзе беларускага ўрада поўплывалі на рашэнне першай сесіі Вярхоўнага Савета БССР пятага склікання, якая 9 красавіка 1959 г. утварыла ўрад БССР у колькасці 22 чалавек, 14 з якіх з'яўляліся членамі складу Савета Міністраў, абранага на першай сесіі Вярхоўнага Савета БССР чацвёртага склікання, уключаючы 12 чалавек, якія захавалі ранейшыя пасады. У склад урада ўвайшлі Старшыня Савета Міністраў Ц.Я. Кісялёў, першы намеснік Старшыні Савета Міністраў І.Ф. Клімаў, намеснікі Старшыні А.І. Золаў і У.Г. Каменскі, старшыня Саўнаргаса БССР А.М. Тарасаў, міністры С.І. Сікорскі (унутраных спраў), І.А. Інсараў (аховы здароўя), К.В. Кісялёў (замежных спраў), Р.Я. Кісялёў (культуры), П.В. Афанасьеў (сувязі), М.М. Луцэнка (сельскай гаспадаркі), П.Л. Коханаў (фінансаў), М.Я. Аўхімовіч (хлебапрадуктаў), І.М. Ільюшын (асветы), М.І. Парашчанка (сацыяльнага забеспячэння), І.М. Жыжаль (будаўніцтва), А.С. Шаўроў (гандлю), І.Д. Вятроў (юстыцыі), старшыня Дзяржплана БССР С.М. Малінін, старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах будаўніцтва і архітэктуры У.А. Кароль, старшыня Камісіі савецкага кантролю Савета Міністраў БССР Ф.А. Баранаў і старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі пры Савеце Міністраў БССР А.І. Перапяліцын [7, с. 213–216, 243–244].

У наступныя некалькі гадоў у сувязі са стварэннем новых цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання Беларусі ўрад быў вымушаны павялічваць колькасць сваіх членаў. У той жа час адбываліся шматлікія пераўтварэнні дзеючых цэнтральных органаў дзяржавы. Усё гэта прывяло да істотных змен персанальнага складу ўрада. Так, толькі ў 1962 г. у яго склад былі ўведзены: У. Е. Лабанок – у якасці першага намесніка Старшыні Савета Міністраў і адначасова міністра створанага 3 красавіка рэспубліканскага міністэрства вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў БССР[3] [6, 1962, № 11,

[1] Да гэтага ў разглядаемы перыяд адбыліся шостая (21–24 сакавіка 1944 г.), сёмая (3 ліпеня 1945 г.) і восьмая (9–11 верасня 1946 г.) сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР першага склікання.

[2] А.С. Шаўроў быў назначаны міністрам гандлю БССР 5 ліпеня 1957 г. [6, 1957, № 7, арт 171; № 10, арт. 245].

[3] Рэспубліканскае міністэрства вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў БССР было створана замест скасаванага 3 красавіка 1962 г. рэспубліканскага міністэрства нарыхтовак, якое былоарганізавана 24 сакавіка 1961 г. на базе міністэрства хлебапрадуктаў БССР [6, 1961, № 10, арт. 80; № 19, арт. 195; 1962, № 11, арт. 66; № 21, арт. 153].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

арт. 67–68, 70; № 21, арт. 153, 158–159]; Г.А. Філіпаў (з 25 снежня яго змяніў Л.І. Хітрун) – старшыня створанага 13 сакавіка 1961 г. рэспубліканскага аб'яднання Савета Міністраў БССР па продажу сельскагаспадарчай тэхнікі, запасных частак, мінеральных угнаенняў і іншых матэрыяльна-тэхнічных сродкаў, арганізацыі рамонту і выкарыстання машын у калгасах і саўгасах ("Белсельгастэхніка") [6, 1961, № 8, арт. 58–59; № 19, арт. 194, 197; 1962, № 21, арт. 153; № 41, арт. 355]; С.О. Прытыцкі – ў якасці намесніка Старшыні Савета Міністраў і адначасова старшыні створанага 18 снежня 1962 г. (замест скасаванай у гэты ж дзень Камісіі дзяржаўнага кантролю Савета Міністраў БССР) Камітэта партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР [6, 1962, № 40, арт. 342–344, 348, 351]; В. П. Несцяровіч – старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па радыёвяшчанню і тэлебачанню, створанага 18 мая 1962 г. у выніку пераўтварэння Камітэта па радыёвяшчанню і тэлебачанню пры Савеце Міністраў БССР [6, 1957, № 6, арт. 159; 1962, № 16, арт. 109; № 21, арт. 153; № 23, арт. 175]; А.Н. Аксёнаў – міністр рэспубліканскага міністэрства аховы грамадскага парадку БССР, створанага 5 верасня 1962 г. у выніку пераўтварэння рэспубліканскага міністэрства ўнутраных спраў БССР [6, 1962, № 28, арт. 233–234; № 40, арт. 348, 352].

У выніку колькасны склад Савета Міністраў БССР, утворанага 29 сакавіка 1963 г. на першай сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі шостага склікання, павялічыўся да 28 чалавек. У снежні 1963 г. у склад урада былі ўведзены старшыні створаных адпаведна 25 ліпеня і 21 верасня гэтага года дзяржаўных камітэтаў Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі (Б. У. Паўлёнак) і па друку (Р. В. Канавалаў) [6, 1963, № 24, арт. 256–257; № 29, арт. 301–302; № 39, арт. 410, 416]. Колькасць членаў урада ўзросла да 30 чалавек.

Калі параўнаць колькасны склад урада БССР у разглядаемы перыяд з даваенным 1938 годам, калі ў яго ўваходзіла 20 чалавек [8, с. 16], то бачна, што к 1957 г. адбылося яго значнае павелічэнне. Гэта тлумачылася больш складанай сітуацыяй, перш за ўсё эканамічнай, якая склалася ў рэспубліцы пасля вайны, шырокім спектрам задач, якія патрэбна было вырашаць. Пры гэтым прыкладна аднолькавая колькасць членаў урада ў гэты час сведчыла аб імкненні зрабіць яго працу больш стабільнай. На апошняе была накіравана і практыка пераемнасці ў форме ўключэння ў кожны новы склад Савета Міністраў пры яго фарміраванні значнай колькасці членаў папярэдняга ўрада. У 1957 г. адбылося найбольш значнае памяншэнне колькаснага складу Савета Міністраў БССР у сувязі з правядзеннем рэформы кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам, аднак у далейшым неабходнасць стварэння новых цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання Беларусі абумовіла паступовы рост колькасці членаў беларускага ўрада.

ЛІТАРАТУРА


1. Конституция (Основной Закон) Белорусской Советской Социалистической Республики, 19 февраля 1937 г. – Минск : Партиздат ЦК КП(б)Б, 1937. – 55 с.
2. Конституция (Основной Закон) Белорусской Советской Социалистической Республики: с изм. и доп., принятыми I, II, IV и V сессиями Верховного Совета БССР. – Минск : Госиздат БССР, 1946. – 23 с.
3. Першая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 12–14 сакавіка 1947 г.: стэнаграфічная справаздача. – Мінск : Дзяржвыдат БССР, 1948. – 67 с.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 968. Воп. 1. Спр. 127.
5. Першая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 3–5 красавіка 1951 г.: стэнаграфічная справаздача. – Мінск : Дзяржвыдат БССР, 1952. – 232 с.
6. Збор законаў, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, пастаноў і распараджэнняў Савета Міністраў Беларускай ССР.
7. Першая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР пятага склікання, 7–9 красавіка 1959 г.: стэнаграфічная справаздача. – Мінск : Дзяржвыдат БССР, 1959. – 260 с.
8. Высшие органы государственной власти и центрального управления Белорусской ССР (1944–1964) : в 2 ч. / Р. П. Платонов, В. К. Ракашевич, М. К. Бобер [и др.]. – Минск : БелНИИДАД, 2003. – Ч. 1. – 266 с.


онный архив библиотеки МГУ имени А.А. Ку